«записанное», что не может не способствовать активизации памяти и расширению активного словарного запаса.

Таким образом, применение конструктора «Bunchems» на уроках русского языка и литературного чтения в начальных классах позволяет ежедневно путем массажа, осуществляемого в процессе игровой деятельности, значительно улучшить мелкую моторику рук учащихся, стимулировать нервные окончания, а значит, улучшить работу головного мозга, расширить словарный запас учащихся, что не может не приносить положительного результата в усвоении учебного материала.

Список использованной литературы

1. Студенческая библиотека онлайн [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://studbooks.net/2034010/pedagogika/passivnyy_aktivnyy_metody_obucheniya. – Дата доступа: 20.02.2019.

2. Селевко, Г. К. Современные образовательные технологии [Электронный ресурс] / Г. К. Селевко // Файловый архив студентов Белорусского государственного педагогического университета имени М. Танка. – Режим доступа: https://studfiles.net/preview/5643299/page:16/. – Дата доступа: 20.02.2019.

3. Элетронный портал [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.navolne.life/post/palchikovye-igry-razvitie-tonkoj-motoriki-i-stimulyaciya-mozga. – Дата доступа: 20.02.2019.

**М. Р. ГАРБАЧЫК**
Брэст, БрДУ імя А. С. Пушкіна

## МАДЭЛІ КАМУНІКАЦЫІ Ў СУЧАСНЫМ ГРАМАДСТВЕ

У сучаснай літаратуры камунікацыі разглядаюцца як дзеянне (аднабаковы працэс перадачы сігналаў без ажыццяўлення аднабаковай сувязі), або як узаемадзеянне (двухбаковы працэс абмену інфармацыяй), або як камунікатыўны працэс, у якім камунікатары выступаюць у ролі крыніцы і атрымальніка інфармацыі.

Адпаведна прадстаўленым у навуковай літаратуры поглядам разнастайныя мадэлі камунікацыі ўзнікаюць зыходзячы з розных задач, якія стаяць перад даследчыкам. Найбольш класічнай з'яўляецца наступная класіфікацыя мадэлей камунікацыі: 1) сацыялагічныя; 2) псіхалагічныя; 3) семіятычныя.

Трэба адзначыць, што ў сучаснай псіхалогіі і сацыялогіі былі адкрыты многія цікавыя мадэлі камунікацыі. Прычым аналіз камунікацыі актыўна

ажыццяўляўся на стыку іх сучасных навуковых падыходаў. Былі вылучаны наступная мадэлі камунікацыі: 1) псіхатэрапеўтычная; 2) міфалагічная; 3) аргуменціруючая; 4) іміджавая; 5) прапагандысцкая.

Разгледзім найбольш вядомыя мадэлі камунікацыі.

*Мадэль Арыстоцеля.* Арыстоцель выдзяляў тры кампаненты працэсу камунікацыі: прамоўца – маўленне – аўдыторыя. У сучасным варыянце яна выглядае як «камунікатар – паведамленне – камунікант». Ва ўмовах вуснага маўлення на першы план вылучаецца аратарскае мастацтва. Аднак трэба адзначыць, што ў часы Арыстоцеля маўленне прамоўцаў стала прызначацца не толькі для вымаўлення, але і для чытання. Пра гэта Арыстоцель спецыяльна адзначае ў «Рыторыцы» (кн. 3, гл. 12), адзначаючы самадастатковасць пісьмовага маўлення. Такім чынам, дадзеная мадэль універсальная: яна адлюстроўвае камунікатыўны акт як у вуснай, так і ў пісьмовай формах. У гэтым акце вылучаюцца тры элементы камунікацыі: прамоўца – маўленне – слухач. Грэчаская традыцыя мастацтва рыторыкі заставалася нязменнай практычна да XX ст. Толькі з развіццём масавых камунікацый праз радыё, кіно, тэлебачанне і пад уплывам патрэбнасці ва ўдасканаленні метадаў прапаганды класічная мадэль перажыла змяненні.

*Мадэль Ласуэла.* Амерыканскі вучоны прапанаваў сваю мадэль камунікацыі, якая стала класічнай у сацыялогіі масавай камунікацыі. Формула Г. Ласуэла стала не толькі мадэллю, якая адлюстроўвае структуру камунікатыўнага працэсу, але і мадэллю даследавання гэтага працэсу, яго структуры і асобных элементаў (табліца).

Табліца – Формула Г. Ласуэла

| Хто паведамляе | Камунікатар | Аналіз кіравання |
|---|---|---|
| Што? | Паведамленне (інфармацыя) | Аналіз зместу |
| Па якім канале? | Канал перадачы | Аналіз сродкаў і каналаў |
| Каму? | Камунікант (аўдыторыя) | Аналіз аўдыторыі |
| З якім эфектам? | Адваротная сувязь | Аналіз выніку |

У 1968 г. Г. Ласуэла прапанаваў больш падрабязную версію сваёй мадэлі камунікацыі, якая прадугледжвае вывучэнне працэсу камунікацыі пры дапамозе адказаў на наступныя пытанні: 1) хто?; 2) з якім намерам?; 3) у якой сітуацыі?; 4) з якімі рэсурсамі?; 5) выкарыстоўваючы якую стратэгію?; 6) аказвае ўплыў на якую аўдыторыю?; 7) з якім вынікам?.

Дадзеная мадэль адлюстроўвае біхевіярысцкі падыход да камунікацыі як да простага ўзаемадзеяння камунікатара на рэцыпіента, які выступае аб’ектам, так ці інакш рэагуючым на атрыманую інфармацыю.

*Мадэль біхевіярызму.* Заснавальнік Джон Б. Уатсан у аснову камунікацыі ставіў не мову як канструкцыю, сістэму, а самі маўленчыя сігналы, маніпуляванне якімі дае магчымасць уплываць на чалавека. Паводзіны чалавека ён атаясамліваў з сістэмай бачных і схаваных рэакцый у схеме «стымул – рэакцыя». Біхевіярысты адносілі ўсе грамадскія з'явы і працэсы да ўзаемадзеяння паміж стымуламі, якія ўздзейнічаюць на чалавека, і рэакцыямі на іх.

*Мадэль Шэнана-Уівера.* Вучоныя распрацавалі матэматычную тэорыю камунікацыі (1949). Дадзеная тэорыя першапачаткова была распрацавана з мэтай аддзяліць фонавыя шумы ад карыснай інфармацыі, якая перадаецца крыніцай. На думку вучоных, лішак у камунікацыі дасягаецца шматкратным паўтарэннем інфармацыі ці яе дубліраваннем з выкарыстаннем іншых каналаў сувязі. Такім чынам, узнікае мадэль двух ці шматканальнай камунікацыі. З узнікненнем гэтай мадэлі ўзнікла ўяўлен-не пра хуткасць і колькасць перадаваемай інфармацыі. Разам з гэтым мадэль Шэнана-Уівера мае пэўныя абмежаванні: 1) механічнасць (адлюстроўвае ў асноўным тэхнічныя спосабы камунікацыі); 2) абстрагаванасць ад значэння перадаваемай інфармацыі; 3) аднанакіраваны лінейны характар камунікатыўнага працэсу, адсутнасць адваротнай сувязі.

*Цыркулярная (цыклічная) мадэль* камунікацыі была прапанавана ў працах У. Шрама і Ч. Осгуда. Вучоныя лічылі, што камунікацыю нельга разглядаць як лінейнае ўзаемадзеянне, паколькі гэта цыклічны працэс і ў час камунікацыі яе ўдзельнікі (крыніца і атрымальнік) перыядычна мяняюцца ролямі. Такім чынам, камунікацыя трактуецца як двухбаковы працэс, сувязі, калі і той, хто адпраўляе, і той, хто атрымлівае інфармацыю, у роўнай ступені ўзаемадзйнічаюць адзін з адным, абменьваючыся паведамленнямі (сігналамі), у выніку чаго камунікацыя ператвараецца ў дыялог.

*Двухканальная мадэль* маўленчай камунікацыі была прапанавана псіхолагам У. П. Марозавым, у якой камунікацыя прадстаўлена як двухканальная сістэма, але не ў тэхналагічным, а ў псіхалагічным плане: У. П. Марозаў прадстаўляе камунікацыю як двухканальны працэс, які складаецца з вербальнага, маўленчага, лінгвістычнага і невербальнага экстралінгвістычнага каналаў. Яго тэорыя заснавана на тэорыі Шэнона, у якой любая сістэма камунікацыі ўяўляе сабой узаемадзеянне наступных асноўных частак: 1) крыніцы інфармацыі (чалавека, які перадае інфармацыю); 2) сігнала (трансліруе інфармацыю ў закадзіраваным выглядзе); 3) прыёмніка ці слухача (валодае ўласцівасцю дэкадзіраваць інфармацыю).

У дадзенай мадэлі была ўлічана роля функцыянальнай асіметрыі мозга чалавека, якая з'яўляецца фізіялагічнай асновай незалежнасці невербальнай функцыі маўлення ад вербальнай.

*Двухступеньчатая мадэль камунікацыі.* Даследаванні ролі масмедыя паказалі, што праз два тыдні ўздзеянне атрыманага паведамлення не падае, а, наадварот, узрастае. Гэта звязана з абмеркаваннем гэтых паведамленняў атрымальнікамі інфармацыі з тымі, каго называюць «лідарамі меркавання». Так, з аднаступеньчатай мадэлі камунікацыі (СМІ – атрымальнікі) узнікла двухступеньчатая (СМІ – лідары думак – атрымальнікі). Калі на першым этапе галоўным момантам становіцца перадача інфармацыі, то на другім у дзеянне ўступае перадача ўплыву. Адсюль узнікае і вывад пра прыярытэтнасць міжасобаснай над масавай камунікацыяй пры спробах пераканаць аўдыторыю.

*Тэорыя «Спіраль цішыні/маўчання»* (распрацавана Э. Ноэль-Нойманам). Адпаведна гэтай тэорыі, сродкі масавай камунікацыі могуць маніпуляваць грамадскім меркаваннем за кошт прадастаўлення слова меншасці замест большасці. Згодна з гэтай гіпотэзай, чалавек, які адчувае сябе ў меншасці, не выказвае свайго меркавання, тым самым як бы далучаючыся да большасці. Калі ж масмедыя карэкціруюць карціну рэальнага размеркавання, робячы большасць меншасцю, яно замаўкае.

Такім чынам, у масавай камунікацыі аказваецца прадстаўленым толькі адзін бок. Другі бок у адказ замыкаецца ў сабе. Функцыя грамадскага меркавання рэалізуецца ў сацыяльным кантроле.

**Н. М. ГУРИНА**
Брест, БрГУ имени А. С. Пушкина

## ОСОБЕННОСТИ КОММУНИКАЦИИ ГЕРОЕВ В ПОВЕСТИ А. ЖВАЛЕВСКОГО И Е. ПАСТЕРНАК «ПОКА Я НА КРАЮ»

Андрей Жвалевский и Евгения Пастернак – русскоязычные писатели из Беларуси. По их же словам, «начинали как “взрослые” писатели, а потом доросли до “подростковых”». Оба закончили физический факультет БГУ, не предполагающий тяги к писательству в художественном стиле, однако оба стали писать с 2009 года в соавторстве именно детские книги. С той поры писательство для них стало способом общения с детьми, как результат, книги получаются искренними, на взгляд литературных критиков – настоящими.

В своем творчестве они не избегают злободневных тем: повесть «Пока я на краю» посвящена подростковым суицидам. Цель данной работы – проанализировать структурно-семантические и прагматические особенности компонентов диалогической речи в указанном тексте. Как отмечают исследователи, нередко прагматический компонент обладает в речевой деятельности большим весом, чем собственно семантический. Силу этого